

ДЫРЭКТЫВА № 2: СУТНАСЦЬ НОВАЎВЯДЗЕННЯЎ 3

ШТО ТАКОЕ АСАБІСТЫ КОДЭКС ГОНАРУ? 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

16 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 114 (29994)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ГЕРАСІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржкантролю:**

*«З'явіўся новы выклік — гэта віртуальныя активы, лічбавыя токены. Яны прыцягваюць усё большую цікавасць суб'ектаў, бо спрыяюць нерэгуляванаму руху капіталу. Пераводы ў лічбавай форме можна здзяйсняць імгненна і з вельмі нізкімі камісіямі, што падкупляе шматлікіх суб'ектаў. У сваёй працы кантралюючыя і праваахоўныя органы сутыкаюцца з аднатыпнымі праблемамі, уласцівымі ўсяму рынку. У прыватнасці, дэцэнтралізаванасць крыптарынку і ананімнасць удзельнікаў аперацый прыводзіць да немагчымасці стварэння дакладных алгарытмаў кантролю за транзакцыямі. Абмежаваны магчымасці аказання прававога ўздзеяння на замежныя крыптавалютныя пляцоўкі. Крыптавалюта мае некаторыя рысы наяўных грошай і, адпаведна, характарызуецца аналагічнымі рызыкамі — гэта значыць, крыптавалюту можна выкарыстоўваць у абсалютна розных мэтах, у тым ліку нелегальных».*

# Першы свой аўтамабіль



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Гэту радыёкіравальную машыну — мару не толькі хлопчыкаў, але і некаторых дарослых мужчын — другакласнік Цімафей ЖУР з Мінска зрабіў сам. Праўда, крыху дапамагаў тата. Узяўшы за аснову сваёй мадэлі вядомую марку аўто, хлопчык, які займаецца ў клубе па інтарэсах, дапрацаваў яе і тэхнічна, і візуальна (чаго вартыя, напрыклад, веласіпеды на багажніку). На канікулах Цімафей сумаваць не будзе, гэта дакладна.**

Сезонны гандаль

## КРАМЯНЫ РОССЫП НА «44-М МЕРЫДЫЯНЕ»

### У сталіцы Палесся ў самым разгары ягадны сезон



Таісія БАСАВЕЦ.

**На цэнтральным рынку Пінска прадаецца ўсё, у тым ліку агародніна, ягады. Але карэнныя пінчукі ўжо шмат гадоў ездзяць па ягады на рынак, які яшчэ называюць «44-ы мерыдыян», бо знаходзіцца ён акурат насупраць крамы з такой назвай. Тут можна купіць сезонную прадукцыю танней, выбар яе надзвычай вялікі.** СТАР. 4

ПаБАЗАРым

## КВІТОК У ФЕСТЫВАЛЬНАЕ ЛЕТА



Фота Аляксандры ГВОЗДЗЕВАЙ.

**Зусім хутка над горадам на Дзвіне загучыць перазвон XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Роўна за 32 дні да яго дырэкцыя форуму і Цэнтр культуры «Віцебск» упершыню сабралі ў паўночнай сталіцы каля 20 сродкаў масавай інфармацыі з усёй краіны, каб пазнаёміць журналістаў з сакрэтамі і навінкамі будучага свята мастацтваў. А іх, сюрпрызаў ад арганізатараў, будзе сапраўды багата. Мы паглядзелі самі, а цяпер раскажам і вам у серыі нататак «ПаБАЗАРым».** СТАР. 4

## КОРАТКА

- Гана хоча выкарыстоўваць беларускую тэхніку для здабычы золата.
- **ДАІ Мінскай вобласці 17—19 чэрвеня адпрацуе аварыйна небяспечныя ўчасткі дарог.**
- Валавы знешні доўг Беларусі зменшыўся ў І квартале на $2,1 млрд.

ISSN 1990 — 763X

23114

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «Мы гатовыя весці дыялог з любой краінай, якая прызнае суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы»

## Прэзідэнт Беларусі прыняў даверчыя граматы паслоў замежных дзяржаў

**У пачатку гэтай урачыстай цырымоніі, якая па традыцыі адбылася ў Палацы Незалежнасці, Аляксандр Лукашэнка прывітаў дыпламатычных прадстаўнікоў іншых краін на гасціннай беларускай зямлі. Кіраўнік дзяржавы выказаў здагадку, што завочна (а магчыма, хтосьці і незавочна) паслы ўжо азнаёміліся з нашай краінай. Цяпер, па яго словах, у іх з'явілася магчымасць на свае вочы ўбачыць, як і чым жывуць беларусы.**

### НА ПРЫНЦЫПАХ АДКРЫТАСЦІ І ГАСЦІННАСЦІ

Прэзідэнт звярнуў увагу, што сустрэча праходзіць напярэдадні дзвюх значных для беларусаў дат — 22 чэрвеня і 3 ліпеня. Першая з іх трагічная — Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, другая — дзень вызвалення Мінска ад фашыстаў, які краіна адзначае як галоўнае свята, Дзень Незалежнасці.

Беларусь ведае цану міру, а таму тэзіс кіраўніка дзяржавы аб тым, што мы выступаем за шматпалярны, справядлівы свет з гарантыямі развіцця для ўсіх краін без выключэння, гучыць як ніколі актуальна. «У гэты час Захад разбурае сістэму еўрапейскай бяспекі, створаную пасля Другой сусветнай вайны, — расставіў акцэнты Прэзідэнт. — Арганізацыя Аб'яднаных Нацый з цывілізаванай дыялогавай пляцоўкі для вырашэння спрэчак і дыскусій аб будучым развіцці свету ператварылася ў дыпламатычнае казіно, дзе вядуць рэй заходнія вяхаводы. Пакуль вядуць рэй. Спрабуюць затармазіць развіццё асобных дзяржаў і цэлых рэгіёнаў, а на граніцах з нязгоднымі разгортваюць ударныя сілы НАТА».

Беларусы, як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, з такім раскладам катэгарычна не згодныя. «І дзе ўсе гэтыя міжнародныя арганізацыі, якія гэта ўсё бачаць, — ААН, АБСЕ, Савет Еўропы, МВФ, Сусветны банк — калі нас ужо трэцяе дзесяцігоддзе душаць незаконнымі санкцыямі? — паставіў пытанне Прэзідэнт. — Адначасова ва Украіне інтэнсіўную падрыхтоўку праходзяць нацыяналістычныя фарміраванні, якія складаюцца з мярзотнікаў усіх масцей. На Захадзе адкрыта заяўляюць, што маюць намер выкарыстоўваць іх для звяржэння ўзброеным шляхам законнай улады ў Беларусі».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што наша краіна як самастойны і адказны ўдзельнік міжнароднай супольнасці ўносіць істотны ўклад у сістэму міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. «Мы гатовыя весці дыялог аб супрацоўніцтве з любой краінай, якая паважае выбар беларускага народа, прызнае суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы — дакладна так, як і вы, — падкрэсліў беларускі лідар. — На аснове раўнапраўя і ўзаемнай выгады. Беларусь заўсёды адкрытая і гасцінная з тымі, хто адкрыты і шчыры з намі. Менавіта на гэтых прынцыпах мы традыцыйна развівалі і развіваем кантакты з усімі партнёрамі».

### «НА КАРЫСЦЬ НАШЫХ КРАІН»

Па традыцыі кіраўнік дзяржавы коратка спыніўся на кожнай з краін, якія прадстаўляюць паслы.

Звяртаючыся да пасла брацкага Таджыкістана, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Хоць змянілася ўжо не адно пакаленне беларусаў і таджыкаў, повязі сяброўства і братэрства ніколі не перарываліся. Гэтаму таксама садзейнічаюць нашы даўнія сяброўскія адносіны з вашым прэзідэнтам Эмамалі Шарыпавічам Рахмонам, які вельмі шмат зрабіў для ўмацавання беларуска-таджыкскага партнёрства».

Гаворачы аб адносінах Беларусі з Ісламскай Рэспублікай Іран, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Мінск і Тэгеран заўсёды глыбока разумелі адзін аднаго, знаходзячыся пад прыгнётам несправядлівых, супрацьзаконных санкцый. «Разглядаем вашу дзяржаву як важнага міжнароднага гульца з вялізным эканамічным патэнцыялам», — заўважыў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да дыпламатычнага прадстаўніка Каралеўства Тайланд у Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Добра разумеем, што цяперашні ўзровень гандлю не адпавядае патэнцыялу, які існуе. Бачым значныя магчымасці для пашырэння двухбаковага супрацоўніцтва: у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, фармацэўтыцы, чаму маглі б садзейнічаць актывізацыя беларуска-тайландскіх кантактаў і абмен візітамі на шматлікіх узроўнях», — дадаў беларускі лідар.

Кажучы аб супрацоўніцтве з Сеулам (Рэспубліка Карэя), кіраўнік дзяржавы заўважыў. «Сёння мы маем шэраг праектаў, па якіх вядзецца работа, але гэтага мала, — перакананы Прэзідэнт. — Сітуацыя ў свеце цяпер няпростая, неабходна прыкласці максімум намаганняў, каб стаць бліжэй».

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, сёння мы па-новаму адкрываем для сябе Афрыку. «Без Афрыкі няма развіцця ў свеце ўвогуле, — у каторы раз паўтарыў беларускі лідар. — Будучыня — за Афрыкай». Так, у супрацоўніцтве з Ганай беларускі бок гатовы ўдзельнічаць не толькі ў сельскагаспадарчых, але і ў інфраструктурных, энергетычных, адукацыйных праектах. «У нас ёсць кампетэнцыі і тэхналогіі, каб дапамагчы вашай краіне нарасціць прамысловы патэнцыял, гарантаваць харчовую бяспеку, мадэрнізаваць транспартную інфраструктуру, павысіць кваліфікацыю кадраў», — абазначыў перад паслом Маўрытаніі ў Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве кірункі супрацоўніцтва Аляксандр Лукашэнка.

«Сёння мы з вялікай цікавасцюназіраем за ростам уплыву Мексікі ў рэгіёне. Нашы дзяржавы валодаюць вытворчым патэнцыялам, развітымі прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, магчымасці якіх павінны быць максімальна выкарыстаны для павелічэння гандлю. Нягледзячы на тое, што ў вас вельмі вялікі і развіты паўночны сусед», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да пасла Мексікі ў Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве.

Пры ўзаемнай цікавасці Беларусь гатовая і да прапрацоўкі з Рэспублікай Панама праектаў супрацоўніцтва ў такіх сферах, як машынабудаванне, перапрацоўчая прамысловасць, хімія і нафтахімія, транспарт, лагістыка, альтэрнатыўная энергетыка. Эквадорскаму боку наша краіна прапануе свае паслугі ў механізацыі сельскай гаспадаркі, развіцці інфраструктуры, рэалізацыі праектаў у сферах здабычы карысных выкапняў і вытворчасці абсталявання.

У завяршэнне цырымоніі Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь ужо доўгія гады застаецца своеасаблівым запаведным краем спакою і стабільнасці. «У гэтым вы зусім хутка пераканаецеся, — сказаў ён паслам. — У такіх умовах, думаю, камфортна жыць і працаваць народу».

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што паслы заўсёды могуць разлічваць на яго асабістую падтрымку і дапамогу ўрада.

**Вераніка КАНЮТА.**

### ❍ У тэму

#### «МЫ ВЕРЫМ У ДЫЯЛОГ»

Як заўважыў у размове з журналістамі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Мексіканскіх Злучаных Штатаў у Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Эдуарда Вільегас Мехіяс**, на жаль, у мінулым адносіны паміж Беларуссю і Мексікай не развіваліся дынамічна і перспектыўна. «Мая мэта як пасла Мексікі ў Рэспубліцы Беларусь — зрабіць узаемаадносіны паміж нашымі краінамі нашмат больш інтэнсіўнымі, мэтанакіраванымі і здаровымі, — паведаміў ён. — Я вельмі зацікаўлены ў развіцці камерцыйнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі. Наведаў Мінскі трактарны завод. Упэўнены, што ў сферы развіцця сельскай гаспадаркі ў нас можа быць вельмі шмат кропак судакранання».

Пасол падзяліўся, што мае намер прадставіць Мексіку нашмат больш шырэй у плане культуры. Ён перакананы, што беларусаў зацікавяць мексіканская літаратура і кіно. Па меркаванні пасла, сектары эканомікі і культуры толькі могуць служыць прыкладам плённага супрацоўніцтва. «Але існуе і вялікая колькасць іншых сектараў для магчымага супрацоўніцтва, — заўважыў ён. — Я цудоўна ведаю, што Рэспубліка Беларусь займае вельмі добрыя пазіцыі ў сферы айці-тэхналогій. Мы верым у дыялог і тое, што нашы краіны павінны быць адкрытымі адзін для аднаго».

#### «АДНОСІНЫ Ў ДУХУ БРАТЭРСТВА»

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Таджыкістан у Рэспубліцы Беларусь Сафарзода Бахтавар Аміралі** адзначыў, што Таджыкістан і Беларусь звязваюць даўнія гістарычныя сяброўскія сувязі. «На гэтым этапе развіцця двухбаковых адносін, улічваючы стратэгічнае партнёрства і сяброўскія, нават, можна сказаць, братэрскія адносіны, паміж двума прэзідэнтамі Эмамалі Рахмонам і Аляксандрам Лукашэнкам, мы павінны развіваць гандлёва-эканамічныя адносіны, ствараць прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу і ў прамысловым асяроддзі, — вызначыў перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва пасол. — Натуральна, карысны абмен вопытам і ў гуманітарнай сферы, у тым ліку навучанне нашых студэнтаў, міжкультурныя зносіны, правядзенне Дзён культуры Рэспублікі Таджыкістан у Рэспубліцы Беларусь і наадварот».

Дыпламат перакананы, што паміж беларускім і таджыкскім народамі вельмі шмат агульнага. Адносіны паміж краінамі на гэтым першым перыядзе развіцця, на яго думку, развіваюцца ў духу братэрства. Пасол расказаў, што ў Беларусі ён не ўпершыню. «Для мяне гэтая краіна знаёмая, — падзяліўся ён. — Вельмі адкрыты народ, адкрытая краіна. Па культурных генах вельмі падобная на Таджыкістан і на таджыкскі народ».

#### «У АБЕДЗВЮХ КРАІН ЁСЦЬ ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ»

Перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва з Беларуссю абазначыла і **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Гана ў Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Ахенеба Леслі Акяа Апоку-Варэ**. Кажучы аб узаемадзеянні ў сферы гандлю, пасол заўважыла, што ў абедзвюх краін ёсць вялікі патэнцыял. «Адна з маіх задач як пасла будзе заключацца ў тым, каб нарасціць двухбаковы гандаль, — удакладніла дыпламат. — Нас перш за ўсё цікавіць сельская гаспадарка. У той жа час Гана багатая прыроднымі рэсурсамі. На Афрыканскім кантыненце мы займаем першае месца па здабычы золата. Спадзяёмся ўзаемадзейнічаць з Беларуссю ў пастаўках з вашай краіны горназдабыўнога абсталявання».

Блізкая ўлада

# ЛЮДЗІ — ПАЧУТЫЯ, ПЫТАННІ — ЗАФІКСАВАНЫЯ

**Прамыя тэлефонныя лініі, якія рэгулярна праводзяцца ў Савеце Рэспублікі, як паказала практыка, настолькі ж эфектыўныя, як і непасрэдна асабістыя прыёмы грамадзян. Пры гэтым чалавеку не трэба нікуды ехаць асабіста і не трэба пісаць зварот. Людзі маюць магчымасць па тэлефоне напрамую выйсці на вышэйшую службовую асобу і агучыць ёй сваю бяду, упэўнены ў Савеце Рэспублікі, дзе ўчора прайшоў чарговы «тэлефонны прыём» Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай.**

За тры гадзіны тэлефон не змаўкаў ні на хвіліну. Тых, хто пазваніў, было вельмі шмат, і тэмы зваротаў самыя розныя: ад нарыхтоўкі кармоў у сельскай мясцовасці да злабадзённых праблем з будаўніцтвам жылля і добраўпарадкаваннем тэрыторый.

— Людзі з усяе краіны, з самага аддаленага яе куточка могуць пастарацца дазваніцца і напрамую выкласці сваё пытанне непасрэдна Наталлі Іванаўне, — расказала **Крысціна ПОБАЛЬ, вядучы рэферэнт аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян Савета Рэспублікі**. — У тэлефонных размовах няма перашкод і пасрэднікаў, не адбываецца нейкі адсеў званкоў. Існуюць жывыя тэлефонныя стасункі грамадзяніна, які дазваніўся, і Старшыні Савета Рэспублікі. Эфектыўнасць такіх «тэлефонных прыёмаў» досыць высокая, таму што людзі гавораць шчыра, і па іх зваротах адразу прымаецца аператыўнае рашэнне (з кім звязацца, куды пераслаць пытанне, чым дапамагчы).

Усе людзі пачутыя, іх пытанні зафіксаваныя, і па кожным дадзена даручэнне пасадзейнічаць. А самае галоўнае — кожны, хто дазваніўся, атрымае адказ аб ходзе вырашэння іх праблемы, і кожнае з пытанняў будзе даведзена да лагічнага завяршэння.

— Чым больш даступнымі для грамадзян будуць органы ўлады, тым лепш людзям і тым менш будзе паўторных зваротаў. Грамадзяне змогуць часцей бываць у дзяржорганах і атрымліваць адказы на пытанні, якія іх хвалююць, — дадала Крысціна Побаль, каментуючы змены, якія прынясе падпісаны **13 чэрвеня** кіраўніком дзяржавы **Указ «Аб змяненні Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», які датычыцца Дырэктывы № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці жыццядзейнасці насельніцтва». Указам прадугледжана павышэнне эфектыўнасці работы дзяржструктур з грамадзянамі і суб'ектамі гаспадарання, а таксама ўдасканаленне ролі мясцовых органаў улады ў вырашэнні праблем, якія хвалююць насельніцтва.**

Падрабязней пра тое, з якімі пытаннямі звярталіся па тэлефоне людзі да Наталлі Качанавай і якія рашэнні і даручэнні па іх былі прынятыя, «Звязда» раскажа ў наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

**Ірына СІДАРОК.**

## Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 17 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 праводзяць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Васілевіч КРАЎЧУК. Тэл. 8 016 226 99 26;
- першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анатоль Канстанцінавіч ЛІНЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Яўгенавіч ПЕТРАЖЫЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч ЧЭРНІКАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Кампетэнтны каментарый

# ДАВОДЗІЦЬ ЗВАРОТЫ ДА ЛАГІЧНАГА ЗАВЯРШЭННЯ

## Валянцін Семяняка расказаў пра чаканні ад змяненняў у Дырэктыве № 2

**Павышэнне эфектыўнасці работы дзяржструктур з грамадзянамі і суб'ектамі гаспадарання, ролі мясцовых органаў улады ў вырашэнні праблем, якія хваляюць насельніцтва, а таксама адкрытасці дзяржорганаў — такія задачы мае на ўвазе Указ «Аб змяненні Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», падпісаны 13 чэрвеня. Гаворка ідзе пра Дырэктыву № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці жыццядзейнасці насельніцтва».**

### ПАЛЕПШЫЦЬ ДЫЯЛОГ ЛЮДЗЕЙ І ЎЛАДЫ

Дырэктыва працуе ўжо больш за 16 гадоў, і, безумоўна, стварыла пэўную прававую базу ў назначаным кірунку работы ў цеснай узаемасувязі з законам аб зваротах грамадзян і іншымі заканадаўчымі актамі. Аднак з часам спатрэбіліся змяненні ў гэтыя нарматыўныя акты, дапаўненне іх зместу і актуалізацыя некаторых пытанняў, у прыватнасці, апошняе датычыцца інфарматызацыі, расказаў **Валянцін СЕМЯНЯКА, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

— Работа са зваротамі грамадзян — адзін з прыярытэтных кірункаў для органаў улады ўсіх узроўняў, дадзенаму пытанню аддаецца пастаянная пільная ўвага кіраўніка дзяржавы. Праз занятасць на асноўным месцы работы і існаванне іншых асабістых пытанняў людзі заўжды негатыўна выказваюцца, калі ім даводзіцца траціць час на адміністрацыйныя працэдуры і звароты да дзяржслужачых, таму згаданыя моманты прапісаны ў Дырэктыве адпаведна з Указам. У дакуменце абазначаны механізм, як аблегчыць зносіны грамадзян з прадстаўнікамі ўлады і больш эфектыўна выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі. Уласна кажучы, такая практыка ўжо ёсць, і яна абмяркоўвалася летась на рэспубліканскім семінары аб дэбюракратызацыі. А прыняты сёлета нарматыўны акт аб актуалізацыі асноўных пытанняў у дадзеным кірунку дапаможа зрабіць гэтую работу больш дзейснай.

Старшыня камісіі мяркуе, што Указ дапаможа не толькі палепшыць дыялог людзей і ўлады, але і ў вырашэнні пытанняў па развіцці тэрыторый і іх асабістых праблемах, якія час ад часу ўзнікаюць і вядомыя дэпутатам усіх узроўняў.

— Усе праблемы агучваюцца падчас прыёмаў і сустрэч, і часам нам прыходзіцца самім умешвацца ў работу дзяржорганаў, каб пэўным чынам скарэкціраваць некаторыя негатыўныя моманты. У абноўленай Дырэктыве дэпутатам усіх узроўняў прадпісана больш актыўна працаваць з ініцыятывамі грамадзян, стымуляваць іх і суправаджаць у ходзе рэалізацыі. І ў гэтым кантэксце сінхронна вядзецца работа над змяненнямі ў закон аб органах мясцовага кіравання і самакіравання, які, як мяркуецца, будзе прыняты на сесіі ў чэрвені, — паведаміў Валянцін Семяняка.

### ГРАШОВЫЯ РЭСУРСЫ ДЛЯ ГРАМАДСКІХ ІНІЦЫЯТЫЎ

У законе, у прыватнасці, акрэслены механізмы па выдзяленні рэсурсаў для грамадскіх ініцыятыў. Часам людзі звяртаюцца да мясцовых дэпутатаў з прапановай аб добраўпарадкаванні тэрыторыі ці правядзенні нейкага мерапрыемства, а грашовыя сродкі на ажыццяўленне гэтага ў мясцовым бюджэце, як правіла, не запланаваны. Абноўлены Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» дае людзям магчымасць не толькі звярнуцца са сваімі ініцыятывамі ў Саветы дэпутатаў, але і атрымаць (у выпадку задавальнення ідэі) грошы на яе рэалізацыю з мясцовага і рэспубліканскага бюджэтаў. У сельсцім бюджэце, дарэчы, сродкі на такія мэты ўжо закладзены. Пры гэтым толькі 10 % ад плануемага кошту работ прыйдзецца аплаціць самім людзям.

— Думаю, згаданая мера дапаможа больш якасна вырашаць мясцовыя праблемы, разглядаць іх з удзелам зацікаўленых службовых асоб і даводзіць да лагічнага завяршэння, — лічыць дэпутат. — А калі такія ініцыятывы будуць задаволены абласнымі асацыяцыямі дэпутатаў, то мясцовыя органы выканаўчай улады павінны будуць выканаць гэтыя работы, прыняць аб'ект на баланс і забяспечыць далейшае функцыянаванне. Гэта рэальная работа і дзеянні, да якіх могуць прыводзіць ініцыятывы грамадзян.

Безумоўна, будзе працягнута работа па правядзенні прыёмаў грамадзян усіх формаў (выязных, асабістых, «гарачых ліній») з выкарыстаннем напрацаванага станоўчага вопыту па выкананні Дырэктывы № 2.

У прыведзеным дакуменце не толькі знайшлі адлюстраванне задачы па паляпшэнні эфектыўнасці ўзаемадзеяння органаў улады з грамадзянамі, але і закладваюцца механізмы рэалізацыі такіх задач, прапрацаваны шляхі іх вырашэння, у тым ліку за кошт тэхналагізацыі працэсаў і пашырэння дзейнасці інфармацыйных рэсурсаў. Усё гэта ў выніку станоўча адаб'ецца на павышэнні дабрабыту грамадзян, перакананы Валянцін Семяняка. Ён падкрэсліў, што прыведзеныя ў Дырэктыве захады па інфарматызацыі работы з грамадзянамі даюць магчымасць не проста аўтаматызаваць працэсы, але і наладзіць зносіны ў абодвух кірунках: ад улады да грамадзян і ад грамадзян да ўлады.

**Ірына СІДАРОК.**

### ЯКІЯ ЗМЯНЕННІ, ДАТЫЧНЫЯ ЗВАРОТАЎ ГРАМАДЗЯН, ПРАДУГЛЕДЖВАЕ УКАЗ

***Указам умоцнена значнасць і эфектыўнасць прамых тэлефонных ліній, што праводзяцца на месцах.***

• Так, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і (або) іх намеснікі будуць праводзіць прамыя тэлефонныя лініі кожную другую суботу з 9.00 да 12.00.

• У той жа час захаваны дзеючы графік правядзення прамых ліній для старшынь раённых, гарадскіх выканкамаў (кожную суботу з 9.00 да 12.00).

• Абавязак правядзення прамых тэлефонных ліній ускладаецца таксама на кіраўнікоў спраў выканкамаў.

Пералічанае будзе садзейнічаць звароту грамадзян непасрэдна на месцы і больш аператыўнаму вырашэнню пытанняў, якія ўзнікаюць, кіраўнікамі раённых, гарадскіх выканкамаў. Улічваючы характар пытанняў, што паступаюць на тэлефонныя лініі, як паказвае практыка, менавіта на гэтым узроўні могуць і павінны здымацца ўсе праблемныя пытанні.

• Адначасова, каб прафесійна падысці да вырашэння пытанняў, якія паступаюць на рэспубліканскі ўзровень, наблізіцца да праблемы, бачыць сістэмныя недахопы па канкрэтных напрамках дзейнасці, працануецца ўскласці правядзенне прамых тэлефонных ліній па суботах (за выключэннем другой суботы) па рашэнні кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання на начальнікаў структурных падраздзяленняў.

***Удакладнены парадак асабістага прыёму грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.***

Да ўнясення змяненняў у Дырэктыву асабісты прыём праводзіўся з 8.00 да 13.00.

Улічваючы занятасць насельніцтва, у мэтах давання магчымасці грамадзянам звароту на асабісты прыём у зручны час прынята рашэнне аб правядзенні кіраўнікамі дзяржаўных органаў, у тым ліку мясцовых органаў улады, асабістага прыёму з 8.00 да 13.00 або з 15.00 да 20.00. Пры гэтым хоць бы адзін раз на месяц асабісты прыём павінен заканчвацца не раней за 20.00.

### ДЛЯ ЖЫХАРОЎ СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

**Аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму даручана:**

***забяспечыць ахоп насельніцтва, якое пражывае ў сельскай мясцовасці, паслугамі сотавай сувязі.***

Акрамя таго, улічваючы развіццё спосабаў накіравання зваротаў, паступовае пашырэнне пераліку працэдур, па якія можна звярнуцца ў электроннай форме, Савету Міністраў даручана ***прыняць меры па забеспячэнні шырокапалоснага доступу да сеткі Інтэрнэт насельніцтва, якое пражывае ў сельскай мясцовасці.***

Парламенцкі дзённік

# АДКАЗНАСЦЬ ЗА ГЕНАЦЫД, АБАРОНА ЎЛАСНАГА ДОМА

## На чарговым пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў дэпутаты прынялі 11 законапраектаў

**Адзін з іх — «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь» — у Авальнай зале прадставіў генеральны пракурор. Змяненні абумоўлены адным з артыкулаў Закона «Аб генацыдзе беларускага народа» і рэгламентуюць парадак вытворчасці па крымінальных справах аб названых злачынствах у адносінах да памерлых асоб — незалежна ад згоды іх блізкіх сваякоў.**

Падрабязна тлумачачы навоўвядзенні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, Андрэй Швед расказаў, што падчас расследавання крымінальнай справы супрацоўнікамі Генеральнай пракуратуры ўстанаўліваюцца асобы, якія ўчынілі злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, якія па розных прычынах не панеслі заслужанага пакарання. «Многія з іх ужо памерлі, заўважыў ён. — У сілу дзеючага заканадаўства крымінальная справа не можа быць узбуджана, а па ўзбуджанай справе вытворчасць падлягае спыненню ў дачыненні да памерлага, за выключэннем выпадкаў, калі вытворчасць па крымінальнай справе неабходна для яго рэабілітацыі. Крымінальна-працэсуальны закон не змяшчае прававых механізмаў, якія дазваляюць расследаваць крымінальную справу ў поўным аб'ёме, а галоўнае — правесці судовы разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да памерлага, калі яго сваякамі не пададзена ва ўстаноўленым парадку адпаведная заява. У той жа час злачынствы супраць міру, бяспекі чалавецтва і ваенныя злачынствы, уключаючы генацыд, не маюць тэрмінаў даўнасці».

У другім чытанні адобраны законапраект «Аб народным апалчэнні», які накіраваны на ўстанаўленне прававых асноў рэалізацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі краіны, права на добраахвотны ўдзел у забеспячэнні ваеннага становішча на тэрыторыі Беларусі. У ходзе падрыхтоўкі законапраекта да разгляду Палатай прадстаўнікоў у другім чытанні ён быў дапоўнены палажэннем, якое ўстанаўлівае паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, мясцовых саветаў абароны паведамляць наймальнікам аб залічэнні работнікаў у атрады народнага апалчэння. З абавязкаў добраахвотніка выключана палажэнне аб неабходнасці паведамляць наймальніку аб уступленні ў народнае апалчэнне.

Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Ірына ДАЎГАЛА**, людзі чакаюць гэтага закона. «Прыязджаючы ў акругу, сустракаючыся са сваімі выбаршчыкамі, пераконваюся зноў і зноў, што людзі нашы, ва ўсякім разе пераважная большасць, — сапраўдныя патрыёты, — падкрэсліла парламентарый. — І яны, як сказаў Прэзідэнт, гатовы абараняць сваіх блізкіх, свой дом, сваю маёмасць. Усе пытанні, якія датычацца арганізацыі і дзейнасці народнага апалчэння, дакладна пазначаны ў законе».

У другім чытанні прагаласавалі за законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях прымусовага лячэння і медыка-сацыяльнай рэадаптацыі». Праект закона распрацаваны ў мэтах удасканалення заканадаўства аб прымусовым лячэнні і медыка-сацыяльнай рэадаптацыі грамадзян, хворых на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію. Законапраектам прадугледжваецца карэкціроўка палажэнняў Закона «Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх» у частцы спрашчэння працэдуры накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі (ЛПП) з улікам правапрымяняльнай практыкі. У сувязі з гэтым праектам закона вызначаецца дзве катэгорыі грамадзян, якія падлягаюць ізаляцыі ў ЛПП, удакладняецца парадак папярэджання грамадзян аб магчымасці накіравання іх у ЛПП, спрашчаецца працэдура медыцынскага агляду грамадзян, неабходнага для вырашэння пытання аб іх накіраванні ў ЛПП, устанаўліваецца абавязак грамадзян, адносна якіх вырашаецца такое пытанне, выконваць законныя патрабаванні службовых асоб органаў унутраных спраў і арганізацый аховы здароўя пры правядзенні медыцынскага агляду.

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША таемна размясцілі ядзерную зброю ў Еўропе

Каардынатар палітыкі і даследаванняў Міжнароднай кампаніі за ліквідацыю ядзернай зброі (ICAN) Алісія Сандэрс-Закрэ паведаміла, што ЗША без афіцыйных заяў размясцілі прыблізна 150 ядзерных снарадаў на еўрапейскіх авіябазах. Яна ўдакладніла, што боепрыпасы размешчаны ў Нідэрландах, Турцыі, Італіі, Германіі, а таксама Бельгіі. Алісія Сандэрс-Закрэ выказала сур'ёзную занепакоенасць ICAN адносна размяшчэння такога тыпу ўзбраенняў у любой еўрапейскай краіне, а таксама нагадала аб Кубінскім ракетным крызісе і дадала, што такія дзеянні могуць павялічыць рызыку ядзернай вайны. Па яе словах, еўрапейскія краіны, якія патрабуюць ад усяго свету празрыстасці ў дачыненні да ядзернай зброі, праяўляюць відавочную двудушнасць у дадзенай сітуацыі. Яна падкрэсліла, што важна звярнуць увагу на даступныя інструменты і задаваць пытанні аб тым, што гэта за бомбы і дзе яны знаходзяцца. Паводле Алісіі Сандэрс-Закрэ, выдаткі ЗША памерам 43,7 мільярда долараў на ядзерную зброю з'яўляюцца жахлівымі.

### У Грэцыі аб'яўлена трохдзённая жалоба па загінулых у моры мігрантах

У Грэцыі працягваецца пошукавая аперацыя пасля крушэння рыбалоўнага судна з мігрантамі з Паўночнай Афрыкі, у выніку якога загінула каля 80 чалавек. Больш як 100 чалавек было выратавана, сотні лічацца зніклымі без вестак. Судна, якое накіроўвалася з Лівіі ў Італію, перакулілася ў міжнародных водах Іанічнага мора непадалёк ад узбярэжжа. Колькі людзей знаходзілася на судне ў момант крушэння, невядома. Выратаваныя мігранты былі дастаўлены ў горад Каламата. Яны расказвалі, што на судне знаходзіліся сотні людзей. Сярод тых, хто выжыў, былі трое мужчын, якіх падазраюць у кантрабандзе людзей, іх затрымалі і дапытваюць. Паводле розных даных, яно магло перавозіць ад 400 да 750 чалавек. Грэчаскія ўлады назвалі крушэнне адной з найбуйнейшых трагедый у гісторыі краіны і аб'явілі трохдзённую агульнанацыянальную жалобу па загінулых, якая працягнецца да вечара суботы.

# КРАМЯНЫ РОССЫП НА «44-М МЕРЫДЫЯНЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І калі клубнічныя рады ўжо даволі працяглыя, радуюць сваёй разнастайнасцю, то чарэшні, вішні толькі-толькі пачынаюць выносіць на рынак. Гэтыя ягады таксама паспяваюць у Пінску на некалькі тыдняў раней, чым у сярэдняй паласе Беларусі. Як высветлілася, з ранку і чарніцы былі на рынку, а каля адзінаццаці гадзін, калі наведалася сюды аўтар гэтых радкоў, гандляры чарніцамі паспяхова рэалізавалі сваю прадукцыю і падаліся дадому, аб чым расказаў прыветлівы прадавец агародніны, што адрэкамендаваўся *«Станіслававіч»*: «Доўга спіш, гаспадынька. А яны ўчора ў лесе былі, сёння з самай раніцы прадалі ягаду і зноў у лес падаліся».

Пенсіянер сказаў яшчэ, што ён не профі, а хутчэй аматар, таму і адмовіўся фатаграфавацца. На рынак прынёс некалькі пучкоў маладзенькіх морквы, буракоў, зяленіва: «Прыязджайце да нас пазней, у нас такія перцы будуць, якіх вы ва ўсёй Беларусі не знойдзеце! А памідоры пінскія нічым не ўступаюць памідорам з паўднёвых краін. Ды і клубніцы ў нас смачнейшыя за іншых. Паглядзіце, якія прыгожанькія трускалкі дзяўчаты прадаюць, толькі на глянцавых часопісы карцінкі змяшчаць!» Вось гэта рэклама, «дзяўчаты» — як выглядае, даплачваць павінны такому суседу.



Але ж Станіслававіч ніколькі не змяніў. Ягадкі на яго радзе былі сапраўды адна ў адну, на такія любавацца можна. Вось як у Таісіі Басавец. Таісія Паўлаўна расказала, што вырошчвае іх на бацькоўскай сядзібе ў вёсцы Цвярдоўка:

— Адпрацавала ў горадзе, выйшла на заслужаны адпачынак і занялася агародніцтвам. Вядома, гэтая ягада паклоны любіць. Напрыклад, сёлета да цвіцення шэсць разоў свае клубніцы палола. А яшчэ я ніякай хіміі не ўжываю для падкормкі, ніякіх угнаенняў, акрамя арганічных. Мае памочнікі — сонца і дождж. У нас зямля балоцістая, вільгаці хапае. Таму і выраслі ягадкі крамяныя, салодкія. Прадаю я па 5-6 рублёў за кілаграм, танней за іншых. Сама расціла, сама стаўлю кошт. Гэта першая прадукцыя. А ў мінулыя гады да 40 вёдзер вырошчвала. Пэўная падтрымка да пенсіі. Сёлета пакуль прагнозы рабіць рана, але ж нешта вырасла, будзе яшчэ паспяваць. Так што на рынку пастаяць давядзецца.

«А яшчэ я каліну вырошчваю, — працягвае Таісія Паўлаўна. — Маю пастаянных кліентаў. Хто ведае лекавыя якасці каліны для нармалізацыі ціску, бяруць у мяне па некалькі вёдзер адразу гэтай асенняй ягады».

Як відаць, на рынку не толькі ідзе купля-продаж, але і завязваюцца знаёмствы, у гандляроў паяўляюцца пастаянныя кліенты. Ёсць такія і ў Марыі Рапецкай. Яе клубніцы памерам з невялікі яблык — сорту «Агнія» — выбіраюць гурманы. Кошт адборнай ягады тут 8 рублёў за кіло, але ж такую ягаду не ўсюды сустрэнеш: тры штукі хопіць, каб пад'есці. Марыя Сцяпанаўна вырошчвае сваю салодкую прадукцыю ў вёсцы Ахова, як яна сказала, у экалагічна чыстай зоне. І ўжо не першы год прадае на рынку.

Першыя пінскія чарэшні прапануюць па 10 рублёў за кілаграм. Марыя Пятроўна, якая прынесла чарэшні, расказала, што вырошчвае іх на ўскраіне горада, у прыватным сектары, наводдаль ад дарог, таму чысціню прадукцыі гарантуе. Вішні ў нешматлікіх гандляроў былі па 7 рублёў. А выбар клубніц сапраўды вялікі: цалкам добрую, прыгожую, але не адборную ягаду можна было набыць і па 4 рублі. Многія гараджане куплялі вёдрамі на джэмы, мусы, кампоты.

Гараджанка Валянціна Саўчук сказала, што ўжо шмат гадоў яны з мужам прыязджаюць на гэты рынак і нарыхтоўваюць ягады, фрукты, агародніну ў сезон. Вось і цяпер купілі два вядры клубніц па вельмі дэмакратычнай цане. Яна робіць свой фірменны джэм, які з блінчыкамі любяць дзеці і ўнукі. Заадно прыхапілі маладой бульбы і зяленіва.

Мой самы першы суразмоўнік Станіслававіч не змяніў, цэны тут сапраўды выгадна адрозніваюцца ад брэсцкіх. Маладая бульба прадаецца па 2,5 рубля. Буракі і морква — па такой жа цане.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара,**
*г. Пінск.*

# КВІТОК У ФЕСТЫВАЛЬНАЕ ЛЕТА

## НА РОЗНЫ ГУСТ І КАШАЛЁК

Тым, хто яшчэ не паспеў набыць білеты на канцэрты на асноўных фестывальных пляцоўках, раім пасяшацца — ужо поўнасцю закрыты продаж на канцэрты ўрачыстага адкрыцця і закрыцця, «Залаты хіт». Яшчэ крыху валошкавых квіткоў засталося на канцэрты «Саюзная дзяржава запрашае...», «Шансон», сольныя канцэрты ў канцэртнай зале «Віцебск».

Але нават калі і не ўдасца трапіць на галоўныя пляцоўкі, то варта проста прыехаць у Віцебск, які цэлы тыдзень будзе кіпець фестывальным жыццём на кожнай вуліцы. Фестываль — гэта не толькі пра канцэрты, але і пра сяброўства без меж, атмасферу свята для ўсіх, незалежна ад нацыянальнасці і ўзросту.

Фестываль вулічнага мастацтва «На сямі вятрах» — гэта сем творчых пляцовак па ўсім горадзе, якія будуць радаваць яго жыхароў і гасцей бясплатна. На Пушкінскай плошчы ў межах Дзён Саюзнай дзяржавы адбудзецца шырокі народны open-air з удзелам найлепшых творчых калектываў Беларусі і Расіі. Арганізатары запланавалі мноства інтэрактыўных пляцовак: радаваць гульнямі, песнямі і адмысловымі беларускімі стравамі будуць падворкі раёнаў Віцебшчыны. А як жа не ўспомніць пра Горад майстроў, дзе штогод прадстаўляюць свае вырабы ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва рамеснікі!

«Мы чакаем сёлета больш за пяць тысяч артыстаў з амаль трох дзясяткаў краін. Не толькі беларусы, але і вялікая колькасць турыстаў цікавіцца нашымі праектамі. Нашы класічныя лакацыі паўстануць у новым выглядзе — гэта і канцэртная зала «Віцебск», і Летні амфітэатр, да 35-годдзя якога зрабілі падарунак і абнавілі арку. Гэта таксама наша пляцоўка open-air, якая вельмі добра зарэкамендавала сябе летась, і нашы вулічныя пляцоўкі фэсту «На сямі вятрах». Застаюцца і звыклыя ўсім тэатральныя, музейныя пляцоўкі, колькасць якіх кожны год павялічваецца», — расказаў **генеральны дырэктар ЦК «Віцебск», дырэктар фестывалю мастацтваў Глеб ЛАПІЦКІ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ФЕСТЫВАЛЬ ФІЛАРМАНІЧНЫ

«Славянскі базар» не толькі пляцоўка для рэалізацыі творчага патэнцыялу, але і моцная адукацыйная прастора. Упершыню ў межах форуму на базе Віцебскай абласной філармоніі будзе працаваць вакальная лабараторыя. Яе работу будуць курыраваць выкладчыкі кафедры вакальнага мастацтва Расійскага інстытута тэатральнага мастацтва. Для найлепшых студэнтаў музычных устаноў адукацыі з усёй краіны правядуць майстар-класы па оперным кірунку прафесары ДІТМа, сярод якіх — Тамара Сіняўская, Наталля Прывалава, Эдзіта Цібілава. Майстар-клас па аналізе музычнага твора і акцёрскім майстэрстве правядзе прафесар Аляксандр Бармак. 16 ліпеня на сцэне філармоніі адбудзецца выніковы канцэрт класічнага мастацтва з удзелам студэнтаў і артыстаў Вялікага опернага тэатра Беларусі ў рамках Дзён Саюзнай дзяржавы.

Таксама ў межах «Славянскага базару» 13 ліпеня ў філармоніі прадставіць сваю праграму вядомы расійскі калектыў — аркестр Якаўлева Grand Melody Orhestra са спецыяльным госцем Варварай. 14 ліпеня ў суправаджэнні Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь аркестра народных інструментаў імя народнага артыста Беларусі Леаніда Іванова на віцебскай сцэне выступіць Алена Пятроўская. 15 ліпеня горад на Дзвіне загучыць іспанскімі матывамі — тут выступіць гітарнае трыа з парай танцораў Barcelona Guitar Trio and Dance.

## «ТЭАТРАЛЬНЫЯ СУСТРЭЧЫ» І «ЛЯЛЕЧНЫ КВАРТАЛ»

Для прыхільнікаў тэатральнага мастацтва падчас фестывалю таксама знойдзецца нямала цікавых мерапрыемстваў. Налета творчае асяроддзе будзе адзначаць 180-годдзе са дня нараджэння жывапісца, адной з ключавых фігур рускага рэалізму Ільі Рэпіна. У гісторыі Віцебшчыны сусветна вядомы мастак пакінуў значны след: пад Віцебскам ён меў сядзібу «Здраўнёва», дзе напісаў звыш 40 работ. Сёння музей-сядзіба з такой назвай з'яўляецца філіялам Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, які штогод прымае тысячы зацікаўленых экскурсантаў.

Да форуму артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа і абласны краязнаўчы музей падрыхтавалі спектакль, прысвечаны памяці і творчаму шляху Ільі Рэпіна. Начны паказ яго пройдзе 15 і 16 ліпеня ў музеі-сядзібе «Здраўнёва». Пасля «славянкі» «коласаўцы» плануюць уключыць спектакль у свой рэпертуар і паказваць гледачам на камернай сцэне тэатра.

Акрамя таго, у праграме фестывальных «Тэатральных сустрэч» запланавана шмат паказаў замежных труп, ухіл сёлета — музычны: 12 ліпеня на пастаноўку «Мы — цыгане» запрашае Маскоўскі музычна-драматычны цыганскі тэатр «Рамэн», 13 ліпеня Маладзёжны тэатр эстрады з Мінска пакажа мюзікл-біяграфію «Гур'янаў». Музычную трагікамедыю па матывах п'есы Чэхава «Вішнёвы SAD» 14 ліпеня прадставіць сталічны незалежны тэатральны праект «ТрыТфармаТ»; знакамітую рок-оперу «Граф Монтэ-Крыста» прывязе Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага 15 ліпеня. Запланаваны ў шырокай праграме сустрэч і драма Максіма Горкага «На дне» Маскоўскага тэатра на Паўднёвым Захадзе, музычны вадэвіль «Клапатун, або Справа майстра баіцца» ДІТМа.

Другі раз у межах фестывалю пройдзе праект «Тэатральная лабараторыя»: сёлета вучыцца акцёрскаму майстэрству ў прафесараў ДІТМа будуць не толькі беларуская студэнты, але і маладыя выкладчыкі. Творам для разбору сёлета абрана п'еса Уільяма Шэкспіра «Гамлет», яе паказ адбудзецца на сцэне коласаўскага тэатра па выніках адукацыйнага праекта.

Для самых маленькіх гасцей і жыхароў горада фестываль падрыхтаваў цікавыя спектаклі ў межах «Лялечнага квартала», які традыцыйна праходзіць пры поўных аншлагах. Упершыню ў культурную сталіцу прыедзе Мурманскі тэатр лялек з «Чырвонай шапачкай» і Новасібірскі тэатр лялек са спектаклем «Карлік Нос». Распачне марафон паказаў Беларускі тэатр «Лялька» з пастаноўкай «Насарог і жырафа», усяго гледачам прапануюць восем разнапланавых спектакляў ад калектываў з Санкт-Пецярбурга, Пярмі, Мурманска, Мыцішчаў, Новасібірска.

## ГАРАЧАЯ КОМІ І «ПРЫВІТАННЕ З БРАЗІЛІІ»

Для аматараў усяго гістарычнага і аўтэнтычнага Віцебскі абласны краязнаўчы музей падрыхтаваў насычаную фестывальную праграму, у межах якой запланавана звыш дзесяці тэматычных выстаў.

У музеі-сядзібе Ільі Рэпіна пад Віцебскам Расійская акадэмія мастацтваў прадставіць праект «Дзве сядзібы — два лёсы», прысвечаны маёнткам мастака ў Здраўнёве і Пенатах. Там жа Дзяржаўны музей Л. М. Талстога прэзентуе экспазіцыю, прысвечаную сяброўству Льва Талстога і Ільі Рэпіна. «Яны добра ведалі адзін аднаго, іх сустрэчы засталіся ў замалёўках і нататках. Музей-сядзіба падчас правядзення фестывалю пашырыць час работы, таму ўсе ахвотныя змогуць наведаць выставы», — расказала **дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Таццяна СТАРЫНСКАЯ.**

У мастацкім музеі бразільскую культуру праз творчасць беларускіх мастакоў прадставіць пасольства гэтай краіны ў межах праекта «Прывітанне з Бразіліі». Цяпер ён выстаўляецца ў Мінску, а ў ліпені адбудзецца прэзентацыя для жыхароў і гасцей фестывалю. Таксама ў музеі прадставіць свае работы з бяросты калектыў з Пракоп'еўска Кемераўскай вобласці, можна будзе набыць вырабы майстроў.

Пасольства Ісламскай Рэспублікі Пакістан трэці раз прывязе ў віцебскую ратушу работы сваіх мастакоў, фотаздымкі, прадметы быту і скульптуру. Да іх далучыцца дэлегацыя Рэспублікі Комі, якая прадставіць у культурнай сталіцы рэдкія музычныя інструменты і свой народны ансамбль «Гулянычка».

У межах форуму адкрыецца юбілейная выстава знакамітых віцебскіх мастакоў — Юрыя і Таццяны Рудэнкаў. Партнёры абласнога музея са Смаленска прывязуць экспазіцыю «Гарады з тысячагадовай гісторыяй», прысвечаную смаленскай крэпасці і віцебскай ратушы. Упраўленне камітэта дзяржаўнай бяспекі Маскоўскай вобласці прэзентуе праект «Беларускі разведчык», гасцям фестывалю прадэманструюць прыватныя калекцыі, а вядомы клоўн Мікалай Чалнакоў запросіць на сваё вясёлае шоу.

## СМЯЯЦЦА ДАЗВАЛЯЕЦЦА!

У снежні мінулага года беларуская каманда Клуба вясёлых і знаходлівых з Магілёва «Доктар Хаус» упершыню за апошнія 22 гады прывезла ў Беларусь чэмпіёнства. Разам з гэтым на галоўную сцэну фестывалю мастацтваў вярнуўся і ўпадабаны гледачамі КВЗ-канцэрт, які апошні раз праходзіў у Віцебску ў 2019 годзе.

У ліпені ў гумарыстычным фестывальным праекце возьмуць удзел шэсць каманд з Беларусі і Расіі: «Доктар Хаус» (Магілёў), «Юра» (Масква), «Барцы. Паўночны дэсант» (Сургут), «Трыёд і Дыёд» (Смаленск), «Руская дарога» (Армавір), «Пушка» (Гродна). Сярод іх — чэмпіёны і ўдзельнікі Вышэйшай лігі КВЗ, якіх добра ведаюць гледачы. Канцэрт пройдзе ў фармаце гульні з візітоўкай і дамашнім заданнем. Ацэньваць каманды будзе кампетэнтнае журы. Кубак «Славянскага базару» пераможцы забяруць у свой горад, застанецца ён у Беларусі або адправіцца ў Расію — даведаемся 16 ліпеня.

«Спадзяёмся, што гэты Кубак на галоўным культурным форуме краіны стане традыцыйным. Аб гэтым сведчаць і водгукі камандаў, якія выступалі на фестывалі ў 2019 годзе, — такога шчырага прыёму і аддачы, як у беларусаў і віцябчан, яны не сустракалі больш нідзе. Сёлета ў жыхароў і гасцей горада будзе ўнікальная магчымасць паглядзець у рэальнасці, як праходзіць сапраўдная гульня. Усе каманды, якія выйдуць на сцэну ў ліпені, так ці інакш звязаныя з Беларуссю: яны прайшлі школу Міжнароднай лігі ў нашай краіне. Ужо цяпер мы можам адкрыта сказаць, што «Славянскі базар» — гэта цэнтр прыцягнення не толькі культуры, але і Міжнароднага саюза КВЗ», — адзначыў **старшыня праўлення Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Гомельскі КВЗ» Аляксей ЧЫСТОЎ.**

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Сядзі і глядзі

# Эфір да дня памяці

**У чацвер 22 чэрвеня ў краіне адзначаецца Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. З гэтай нагоды ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала гледачоў чакае тэматычны эфір з паказам мастацкіх, дакументальных фільмаў і выпускаў праграм.**

Распачнецца ён паказам кінааповесці «Цераз могілкі» (Беларусьфільм, 1964 г.) рэжысёра Віктара Турава. Аповед пра гераізм беларускіх партызанаў у гады Вялікай Айчыннай вайны пераплецены з чалавечымі ўзаемаадносінамі, паказваецца, як адна з гісторый, якія адбываліся ў тыя часы на нашай тэрыторыі. Варта адзначыць, што пасля выхаду фільм атрымаў шэраг узнагарод, у тым ліку дыпломы і прызы. Віктару Тураву — за выдатны рэжысёрскі дэбют, Уладзіміру Мартынаву — за акцёрскі дэбют, аператару Анатолю Забалоцкаму — за выяўленчае рашэнне фільма на V Кінафестывалі рэспублік Прыбалтыкі,



Беларусіі і Малдавіі (Талін, 1965 г.). А сёння гэтая кінастужка — класіка, якую абавязкова трэба паглядзець.

Апоўдні — мінута маўчання. Пасля ў 12.05 і 17.55 выпускі з цыкла «Памяць зямлі маёй» пра мемарыяльныя комплексы «Трасцянец» і «Брэсцкая крэпасць-герой». У 13.50 і 21.45 адбудзецца паказ мастацкага кінафільма «Беларускі вакзал» (СССР, 1970 г.). У 15.30 варта будзе паглядзець адзін з выпускаў праграмы «Кадры жыцця», бо госцем яго будзе дырыжор, кампазітар, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Варапаеў (дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны). Вечарам у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» прагучыць канцэрт сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі «Рэха вайны». А завяршальным штрыхом памятнага дня стане выпуск праграмы «Кампазітары Беларусі» з расповедам пра Уладзіміра Алоўнікава.

**Алена ДРАПКО.**



## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 174

**Сваю новую задачу даслаў нам Міхаіл Кошаль з Мінска (гл. дыяграму).**




**Белыя:** Kpf6, Фb6, Ch2, Kd2 (4).

**Чорныя:** Kpd5, Kb3, пc6 (3).

Мат за два хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

Нашы юныя суайчыннікі паспяхова выступілі на чэмпіянаце свету па хуткіх шахматах да 8-18 гадоў у Батумі (Грузія). Сярод юнакоў да 16 гадоў сярэбраны медаль заваяваў Міхей Навуменка з Оршы, сярод дзяўчат у той жа ўзроставай катэгорыі такую ж узнагароду атрымала Ксенія Норман з Гродна. Бронзавыя медалі на рахунку Даміра Булгака з Мінска (сярод хлопчыкаў да 10 гадоў) і Максіма Царука (сярод юнакоў да 18 гадоў). У сваіх групах чацвёртыя месцы занялі Арцём Стрыбук і Кацярына Зубкоўская, пятыя — Арцём Сіняўскі і Варвара Палякова, а яшчэ ў беларускіх шахматыстаў адно шостае месца, два сёмых, адно восьмае...

* * *

На турніры ў Рагачове прызавую тройку турніру па хуткіх шахматах (81 удзельнік) склалі Дзмітрый Кананенка, Максім Царук і Сяргей Барысчык, па бліцы (79 гульцоў) — Максім Царук, Яраслаў Навумовіч і Арцём Бяляўскі.

У Магілёве ў дваццаць другі раз прайшоў турнір на прызы гросмайстра Аляксея Фёдарава. Сярод дзяцей перамаглі: у старэйшай групе (32 удзельнікі) — Цімур Гваздзеў, у малодшай (59 гульцоў) — Мікіта Новікаў. У турніры па хуткіх шахматах, дзе гулялі і дарослыя (30 удзельнікаў), першынстваваў міжнародны майстар Пётр Карзубаў.

Міхаіл Нікіценка выйграў Мемарыял Рашыда Нежмятдзінава ў Казані (186 гульцоў), набраўшы 7 балаў з 9.

У шахматным турніры 9-й міжнароднай спартакіяды ветэранаў у Мінску перамог майстар спорту Уладзімір Верамейчык з Гродна, сярод жанчын першае месца заняла гросмайстар Таццяна Багуміл з Маскоўскай вобласці.

* * *

Прапануем вашай увазе некалькі партый з сёлетніх чэмпіянатаў Беларусі.

Арцём Сіняўскі — Сяргей Вашчылаў. 1. e4 d5 2. ed Ф:d5 3. Kc3 Фd6 4. d4 Kf6 5. h3 c6 6. Kf3 Cf5 7. Ce2 h6 8. 0-0 e6 9. Ле1 Kbd7 10. Cf1 0-0-0 11. Ke2 g5 12. c4 Фb8 13. Kg3 Ch7 14. Фe2 Cb4 15. Cd2 Cd6 16. Ca5 b6 17. Cc3 C:g3 18. fg Ke4 19. g4 Лhe8 20. a4 c5 21. a5 Kg3 22. Фe3 Ce4 23. ab ab 24. b4 f5 25. bc fg 26. Ke5 K:e5 27. de gh 28. Ф:g3 hg 29. C:g2 Лd3 30. Ле3 Л:e3 31. Ф:e3 C:g2 32. Kp:g2 Фb7+ 33. Фf3 Ф:f3+ 34. Kp:f3 Лf8+ 35. Kpe3 Лf4 36. cb Л:c4 37. Cd4 Лb4 38. Лh1, 1:0.

Дзяніс Лазавік — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 d5 4. cd ed 5. Cg5 c6 6. e3 Ce7 7. Cd3 Kbd7 8. h3 0-0 9. Kf3 Ke4 10. Cf4 Kdf6 11. Фc2 Ле8 12. 0-0 Cf5 13. Ke5 Фc8 14. f3 Kd6 15. e4 Ce6 16. ed cd 17. g4 Фd8 18. b3 Лc8 19. Лac1 b5 20. Фf2 Фb6 21. Ce3 g6 22.Ke2 Л:c1 23.Л:c1 Лc8 24.Лc5 Фb7 25.Kf4 a6 26.Фc2 Kd7 27.K:e6 fe 28.Л:c8+ K:c8 29.C:g6, 1:0.

Маргарыта Бендзік — Варвара Палякова. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Kc3 Kf6 4. Cb5 Kd4 5. 0-0 K:b5 6. K:b5 a6 7. Kc3 d6 8. d4 ed 9. K:d4 Ce7 10. f3 0-0 11. Ce3 d5 12. e5 Ke8 13. Kb3 c6 14. Ka4 f6 15. Kb6 Лb8 16. c4 dc 17. K:c4 Ce6 18. Фe2 Фd5 19. Лac1 fe 20. a4 e4 21. f4 Фd3 22. Ф:d3 ed 23. Kc5 Cg4 24. Ke5 Ce2 25. Лf2 C:c5 26. C:c5 Лd8 27. C:f8 d2 28. Лd1 C:d1 29. Cb4 Ce2, 0:1.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Лd6! Правільна адказалі: Міхаіл Кошаль, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ЧЫТАЙЦЕ Ў ЧЭРВЕНЬСКАЙ «АЛЕСІ»

### «МАЯ ГАЛОЎНАЯ МАТЫВАЦЫЯ — ЖЫЦЬ НА ПОЎНУЮ»




